**Матэрыялы V навуковай канферэнцыі
Беларускага Гістарычнага Таварыства
БЕЛАРУСКАЯ СЯЛЯНСКА-РАБОТНІЦКАЯ ГРАМАДА
Ў КАНТЭКСЦЕ НАЦЫЯНАЛЬНАГА АДРАДЖЭННЯ
XIX–XX ст.
(Менск, 4 – 5 чэрвеня 2005 г.)**

# Уступнае слова старшыні аргкамітэту

Сёлетні год – год юбілеяў. Па-першае, мы праводзім V канферэнцыю БГТ, па-другое, выйшаў 10 том *Гістарычнага Альманаху*. Апроч таго, трое актыўных сяброў БГТ таксама святкуюць юбілеі. Гэта Святлана Марозава, Валянціна Лебедзева і Валянцін Голубеў. Выканкам Беларускага гістарычнага таварыства вырашыў узнагародзіць нашых юбіляраў за актыўную і плённую навуковую дзейнасць спецыяльнымі дыпломамі.

Некалькі слоў пра нашу працу. Беларускае гістарычнае таварыства было створана ў 2000 г. як рэалізацыя ініцыятывы, выказанай у Беластоку годам раней. Нашая арганізацыя ўключае ў сябе прафесійных гісторыкаў і фармальнай падставай для сяброўства ў Таварыстве з’яўляецца навуковая ступень кандыдата навук. Мэтай дзейнасці БГТ мы лічым стварэнне суб’ектнай гісторыі Беларусі. На сённяшні дзень у складзе Таварыства каля 60 сяброў.

Мы ўжо арганізавалі чатыры канферэнцыі. У 2000 г. у Гародні – “Праблемы беларускай гістарычнай навукі”, напрыканцы таго ж году ў Магілёве – “Праблемы перыядызацыі беларускай гісторыі”, у 2003 г. у Менску – “Праблемы тэрміналогіі гістарычнай навукі”, і таксама ў Менску ў 2004 г. – “Гістарыяграфія часоў БССР”. Матэрыялы апошняй канферэнцыі апублікаваныя ў томе 10 *Гістарычнага Альманаху*. Пятая канферэнцыя прысвечаная Беларускай сялянска-работніцкай Грамадзе. Яна таксама юбілейная, бо ў гэтым годзе спаўняецца 80 гадоў з дня заснавання Грамады. Ідэя правядзення сённяшняй канферэнцыі належыць прафесару Яўгену Мірановічу. Арганізацыйны камітэт вырашыў пашырыць тэматыку і разглядаць гісторыю Грамады ў кантэксце беларускага нацыянальнага Адраджэння двух апошніх стагоддзяў. Мэтаю канферэнцыі з’яўляецца акцэнтацыя ўвагі навуковай грамадскасці Беларусі на азначанай праблеме.

***Аляксандар Краўцэвіч***